*А. І. Сцепанцоў*

# КАДРЫ КУЛЬТУРЫ ЯК МЭТА І ВЫНІК БЕСПЕРАПЫННАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ

Адным з найбольш значных сродкаў сацыяльнага ўзнаўлення грамадства, павышэння яго інтэлектуальна-творчага патэнцыялу і перспектыў культурнага развіцця з’яўляецца сацыякультурная прафесійная адукацыя як важнейшая сістэма замацоўвання сацыяльна-культурных каштоўнасных арыенціраў і прыярытэтаў, забеспячэння працэсу сацыялізацыі індывіда, падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў культуры да выканання і развіцця неабходных відаў культурнай дзейнасці.

Вывучаючы навакольны свет, яго складнікі і ўзаемасувязі, мы з асаблівай увагай характарызуем (паводле тэрміналогіі культуралогіі) носьбіта прадметна-практычнай дзейнасці або спазнання, крыніцу і агента актыўнасці, гэта значыць суб’екта дзейнасці і яго скіраванасць на аб’ект. Суб’ектам можа выступаць як індывід, асобны чалавек, так і сацыяльная група, некаторая сукупнасць людзей [1]. У сферы культуры такім калектыўным суб'ектам выступаюць кадры культуры. Кадры валодаюць адмысловымі запасамі творчай энергіі, якая не толькі падсумоўвае індывідуальную творчую энергію, але і дае новую якасць, накіроўвае на калектыўнае тварэнне, спажыванне і духоўнае засваенне аб’ектаў культуры, узнаўленне сябе ў пэўнай гістарычнай эпосе, перабудову сацыяльна-культурнага асяроддзя. Аб’яднанне індывідаў у супольнасць паўстае як носьбіт пэўных нормаў дзейнасці, калектыўнага мыслення, калектыўных каштоўнасцей і ўяўленняў, калектыўнай памяці. Такім чынам, кадры культуры з’яўляюцца суб’ектам культурнай дзейнасці і выступаюць як калектыўная супольнасць, устойлівае сацыяльна-прафесійнае аб’яднанне людзей на функцыянальна-дзейнаснай аснове са спецыялізацыямі ў культурна-асветным, тэатральна-відовішчным, адукацыйным напрамках. Яны валодаюць збіральнай творчай энергіяй і інфармацыйна-творчай магутнасцю для задавальнення грамадскіх патрэбнасцей у аматарскай і прафесійнай творчасці.

Сацыяльная псіхалогія вылучае тры найважныя крытэрыйныя ўласцівасці калектыўнага суб’екта.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

1. Узаемазвязанасць і ўзаемазалежнасць індывідаў як стан актыўнасці – перадумовы і галоўнай прыкметы калектыўнага суб'екта. Гэтыя ўласцівасці выяўляюцца праз паказчыкі: а) дынамічныя (інтэнсіўнасць, або цесната ўзаемных сувязей і залежнасцей паміж індывідамі ў групе); б) змястоўныя (змест, або прадмет узаемных сувязей і залежнасцей).

2. Здольнасць выяўляць сумесныя формы актыўнасці, быць адзіным цэлым па стаўленні да іншых сацыяльных аб'ектаў або па стаўленні да сябе самога (зносіны ўнутры групы і з іншымі групамі, групавыя дзеянні, сумесная дзейнасць, групавое стаўленне і паводзіны, міжгрупавое ўзаемадзеянне).

3. Здольнасць да самарэфлексіі, у выніку якой фарміруюцца пачуццё «мы» (у першую чаргу як перажыванні сваёй прыналежнасці да групы і яднанне са сваёй групай) і вобраз «мы» (як групавое паданне аб сваёй групе) [2].

Усе тры асноўныя прыкметы калектыўнага суб'екта маюць яркую праяву пры вывучэнні кадраў культуры па напрамках сацыякультурнай работы з насельніцтвам, прафесійнай мастацкай творчасці, прафесійнай адукацыі. Вывучэнне характарыстык аб'яднанняў індывідаў ва ўстойлівыя калектывы падаецца вельмі важным у сістэме культуралагічных ведаў, бо пазнаецца сацыяльная кансалідацыя, рэгуляцыя, камунікацыі і ўзнаўленне індывідаў. Улік калектыўных працэсаў дае магчымасць больш наблізіцца да разумення развіцця культуры і пазнання. Кадравая супольнасць інстытута сацыякультурнай работы з насельніцтвам аб'ядноўвае спецыялістаў культурна-асветных арганізацый – музеяў, бібліятэк, клубных устаноў, іншых тыпаў арганізацый культуры, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць праз забеспячэнне доступу фізічных асоб дакультурных каштоўнасцей, што знаходзяцца ў фондах гэтых арганізацый, або праз стварэнне ўмоў для авалодання народнай і мастацкай творчасцю, самаадукацыяй, а таксама для духоўнага і фізічнага развіцця. Кадравая супольнасць інстытута прафесійнай мастацкай творчасці аб'ядноўвае спецыялістаў тэатральна-відовішчных устаноў – тэатраў, цыркаў, канцэртных арганізацый, іншых тыпаў арганізацый культуры, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць праз падрыхтоўку, арганізацыю, паказ і правядзенне спектакляў, канцэртаў ці іншых публічных паказаў. Іх асноўныя задачы – зберажэнне каштоўнасцей сусветнай і нацыянальнай культуры, стварэнне і распаўсюджванне разнастайных культурных даброт,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

задавальненне духоўных патрэбнастей насельніцтва. Кадравая супольнасць інстытута адукацыі ў сферы культуры мае першаступеннае значэнне для аптымальнага фарміравання сацыяльнай структуры ўсіх сфер грамадства, бо ў яго межах фарміруецца палітычная, эканамічная і культурная эліта. Адукацыйныя ўстановы ў сферы культуры забяспечваюць перш за ўсё данясенне каштоўнасцей культуры ў грамадства праз навучанне дзяцей, моладзі, падрыхтоўку спецыялістаў. Тым самым праз пераемнасць мастацка-адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца захаванне і развіццё мастацкай культуры. Спецыялісты галіновых устаноў не толькі перадаюць веды і свой вопыт, выкладаючы той ці іншы прадмет мастацтва ці раскрываючы сакрэты інтэрпрэтацыі, многія з выкладчыкаў з'яўляюцца непасрэднымі творцамі мастацкіх каштоўнасцей і сваёй творчасцю, а таксама творчасцю сваіх вучняў абумоўліваюць узровень мастацкай культуры, уплываюць на слухацкую і глядацкую аўдыторыі.

Як трапна заўважыў Ю. М. Салонін, «індывідуальны або калектыўны культурны суб'ект выяўляецца толькі тады, калі ў ім адчувальна прысутнічаюць надпрыродная духоўнасць, сфарміраванасць або выхаванасць па вызначанай культурнай мадэлі, а таксама творчая ініцыятыва» [1].

Такой мадэллю з'яўляецца сацыякультурная адукацыя як сістэма фарміравання светапоглядных усталёвак грамадства, вывучэння, засваення і ўзнаўлення сістэмнай сукупнасці духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам; сістэма падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў для падтрымання функцыянавання ўстаноў культуры і іх руху наперад. Адукацыя канструіруе такія эфекты грамадскага развіцця, як сацыяльная кансалідацыя грамадства, грамадская ідэнтычнасць прадстаўнікоў розных сацыяльных груп і нацыянальных культур, сацыяльны давер, сацыялізацыю падрастаючых пакаленняў, сацыяльную стратыфікацыю насельніцтва [3].

Вывучэнне сістэмы сацыякультурнай прафесійнай адукацыі мае ключавое значэнне пры распрацоўцы шляхоў і метадаў арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці, умоў для культурных зносін, творчага станаўлення спецыялістаў культуры, пастаяннага паглыблення іх кампетэнтнасці, прафесіяналізму. Прафесійная адукацыя рыхтуе кваліфікаваныя кадры, якія падтрымоўваюць і развіваюць адаптыўныя магчымасці грамадства ў пастаянна зменлівых пстарычных умовах праз выкананне і развіццё неабходных відаў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дзейнасці, пазнання, тэхналогій, інструментарыю. Бесперапыннасць адукацыі прадугледжвае пераемнасць і ўзаемнае дапаўненне фармальна рэгламентаванага навучання і нефармальнай ініцыятыўнай самаадукацыі. адзінства процілеглых пачаткаў – грамадскіх патрабаванняў да сацыялізацыі і прафесіяналізацыі і індывідуальных інтэрэсаў, схільнасцей і здольнасцей людзей. Спецыялісты рыхтуюцца для шматролевай культурнай дзейнасці, асобаснай і прафесійнай самарэалізацыі, для працягу самаадуацыі. Сацыякультурную прафесійную адукацыю правамерна вызначыць як сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў – стваральнікаў і інтэрпрэтатараў каштоўнасцей культуры, спецыялістаў навуковага асэнсавання заканамернасцей культурнага працэсу, арганізатараў паслуг у сферы вольнага часу, якія валодаюць эфектыўнымі тэхналогіямі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Сацыякультурная прафесійная адукацыя ў адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі» можа быць падзелена на два блокі: мастацкі і культуралагічны. У першым – мастацтва выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное, музычнае, сцэнічнае і экраннае, эстраднае і цыркавое, народная творчасць, дызайн; у другім – культуразнаўчыя навукі, камунікацыі. Сутнасць мастацкай адукацыі можа быць вызначана як замацаванне і развіццё схільнасці да творчай дзейнасці, набліжэнне да асэнсавання яе сутнасці, выпрацоўка ўменне дзейнічаць у пэўным відзе мастацтва лёгка і прыгожа. Прафесійная мастацкая адукацыя – тэхналагічна пабудаваная дзейнасць з мэтай стварэння мастацкіх каштоўнасцей. Культуралагічная адукацыя забяспечвае набыццё сукупнасці прафесійных ведаў, уменяў і навыкаў навуковага асэнсавання заканамернасцей творчага працэсу стварэння, засваення, захавання, распаўсюджвання і аднаўлення каштоўнасцей культуры, рэалізацыю эфектыўных культурастваральных тэхналогій.

Важнае значэнне мае эстэтычная адукацыя**,** якая прызначана фарміраваць эстэтычны погляд на сусвет, садзейнічаць гуманізацыі грамадства. Аднак прадметы мастацкага цыкла займаюць невялікую частку вучэбнага часу – агульнаадукацыйная школа захоплена політэхнізацыяй, што наносіць шкоду гуманітарнаму цыклу і самой адукацыі, якая паўстала ва «ўсечаным» выглядзе, з дэфіцытам у выхаванні творчых пачаткаў, эстэтычнага адчування і вобразнага мыслення. Не выпраўляе становішча існаванне разгорнутай сеткі дзіцячых школ мастацтваў, якія даюць

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

паглыбленыя веды ў розных відах мастацтва, аднак ахопліваюць толькі дзясятую частку дзяцей. Паўстае пытанне аб неабходнасці вучыць усіх дзяцей мастацтву без выключэння, бо толькі так магчыма дасягнуць мэты ў фарміраванні адукаванага, культурнага грамадства.

Прафесійная адукацыя спецыялістаў культуры можа быць прадстаўлена ў тэарэтычнай мадэлі, якая мае славесна-лагічную прыроду і дае вобраз адукацыйнай рэальнасці з характарыстыкамі і функцыянальнымі паказчыкамі аб’екта-арыгінала. Мадэль адлюстроўвае перманентны працэс паляпшэння якасці адукацыі асобы, пашырэння прафесійнага гарызонту на працягу актыўнага творчага жыцця. Выніковасць і дынамічнаць гэтага працэсу забяспечвае ўся сістэма прафесійнай адукацыі сферы культуры, якая будуецца на развіцці інтэлекту і эмацыянальнай сферы сучаснага чалавека. У межах гэтай сістэмы адбываецца набыццё і развіццё ўмення выказаць сябе і навакольны мір словамі, музычнымі гукамі, рухамі, фарбамі праз адпрацаваную з апорай на прыродныя задаткі і здольнасці тэхналагізацыю працэсу навучання, што дазваляе ўпарадкаваць, сінхранізаваць тэмпы развіцця ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі, збалансаваць механізм іх узаемадзеяння, удасканаліць крытэрыі адбору кадраў для прафесійнай дзейнасці, дае магчымасць замацаваць спецыфічныя прафесійныя якасці навучэнцаў. Таленавітая моладзь атрымоўвае магчымасць набываць практычныя ўменні і навыкі прадуктыўнай культурнай дзейнасці, атрымоўваць прафесію і далей у любым узросце абнаўляць, дапаўняць раней набытыя веды, уменні, пастаянна пашыраць свой кругагляд. Мадэль раскрывае паслядоўнасць разгортвання працэсу навучання і фарміравання спецыялістаў па *ўзроўнях* ускладнення адукацыйнай і творчай дзейнасці. Першы (пачатковы) узровень – *прафесійна-арыентацыйны* – фарміраванне каштоўнасных арыентацый, эстэтычнага погляду на сусвет і вобразнага мыслення, набыццё зыходных прафесійных навыкаў і прафесійнай арыентацыі ў культуры; другі, *прафесійны сярэдні,* – развіццё і замацаванне аналітычна-канструктыўных, вобразна-прасторавых, вербальна-прапазіцыянальных якасцей інтэлекту; праяўленне творчай фантазіі, мастацкіх эмоцый; увядзенне ў розныя віды культурнай практыкі; трэці ўзровень – *прафесійны вышэйшы,* – атрыманне навыкаў прадукцыйнай дзейнасці ў абранай сферы культуры, самавызначэнне ў прафесіі, засваенне фундаментальных і прыкладных ведаў і ўменняў па функцыях і тэхналогіях будучай культурнай дзейнасці; чацвёрты, *майстэрства і самасцвярджэнне,*

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

– стварэнне, інтэрпрэтацыя, прапаганда культурных каштоўнасцей, навуковае і творчае асэнсаванне культурнай дзейнасці, здабыванне сацыяльнай і прафесійнай сталасці; самаадукацыя – развіццё і рэгуляцыя індывідуальна-асобасных якасцей, пастаяннае павышэнне прафесійнага майстэрства. Кожны ўзровень адукацыі з'яўляецца падсістэмай цэласнай мадэлі прафесійнай адукацыі ў сферы культуры, якую вызначаюць адметныя ўласцівасці: *пабудаванасць усёй сістэмы навучання на эмацыянальна-псіхалагічным асваенні свету і развіцці творчых задаткаў*; *неабходнасць ранняга прафесійнага адбору моладзі на падставе выяўлення іх прыродных здольнасцей і забяспячэнне бесперапыннай паслядоўнасці прырашчэння прафесійных ведаў, уменняў, навыкаў*; *развіццё здольнасцей асэнсавання заканамернасцей культуратворчасці*; *набыццё арганізацыйных уменняў у рэалізацыі духоўна-эўрыстычных, інтэлектуальных, мастацка-творчых патэнцый людзей, праяўленняў іх сацыяльна-культурнай актыўнасці.* Мадэль бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры аб'ядноўвае ў адзіным комплексе *асобасна-гуманістычныя каштоўнасці* (плюралізм, індывідуальнасць, самадэтэрмінацыю, зменлівасць, нелінейнасць) і *каштоўнасці культурна-тэхналагічныя* (адказнасць, адзінства ў дзеяннях, устойлівасць і ўзнаўляльнасць практыкі, валоданне культурнымі нормамі, адзіным полем ідэнтыфікацыі, універсальнага дзяржаўнага адукацыйнага стандарту. Вызначана *місія* бесперапыннай прафесійнай адукацыі спецыялістаў культуры – забеспячэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы, апераджальная падрыхтоўка спецыялістаў да актыўнай дзейнасці ў сферы культуры. Мадэль заснавана на *прынцыпах* пераемнасці ўзроўняў адукацыі; няспыннасці папаўнення ведаў, уменняў, навыкаў; кампетэнтнаснай арыентацыі ў атрыманні вынікаў адукацыі; міждысцыплінарнасці зместу адукацыі; узаемадапаўнення тэхналагічных прыёмаў і эстэтычнага даследавання, фантазіі.

Мадэль з'яўляецца *падабенствам* аб'екта-арыгінала, яго змястоўнай інтэрпрэтацыяй, асэнсаваным выразам, узнаўленнем у знакавай форме (тэорыя) істотных уласцівасцей [4]. Мадэль бесперапыннай адукацыі спецыялістаў культуры выяўляе параметры руху працэсу навучання да атрымання чакаемых вынікаў – *дасягнення акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый, прадуктыўнага самаразвіцця асобы ў сферы культурастваральнай практыкі,* і выводзіць на асноўны вынік – эфектыўную вытворчасць кадраў культуры.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Графааналітычная мадэль
бесперапыннай адукацыі спецыялістаў




БІБЛІЯТЭКА БДУКІ

*1. Культурология:* учебник / под ред. Ю. Н. Солонина, М. С. Кагана. – М.: Юрайт-Издат, 2005. – 566 с.

2. *Проблема* субъекта в психологической науке / отв. ред. член-корреспондент РАН, профессор А. В. Брушлинский, канд. психол. наук М.Н. Воловикова, профессор В.Н. Дружинин. – М.: Академический проект, 2000. – 320 с.

3. *Асмолов, А. Г.* Стратегия социокультурной модернизации образования: на пути к преодолению кризиса идентичности и построения гражданского общества / Вопросы образования. – 2008. – № 1. – С. 65–82.

4. *Вартофский, М.* Модели. Репрезентация и научное понимание: пер. с англ. / М. Вартофский; общ. ред. и послесл. И.Б.Новика и В.Н.Садовского.– М.: Прогресс, 1988.– 507 с.

5. *Штоф, В. А.* Роль моделей в познании / В. А. Штоф. – Л.: Лениздат, 1979. – 345 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ